ПРЭЗЕНТАЦЫІ



# «СКІНУЦЬ» «ЖЫЦЦЁВЫЯ ПУТЫ»

**спрабавалі 26 кастрычніка ў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я. Ф. Карскага. Тут адбылася прэзентацыя новай кнігі сучаснай беларускай прозы. Яе аўтар старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Людміла Антонаўна Кебіч.**

У аддзеле мастацтва было шматлюдна. Творчасць Людмілы Кебіч без перабольшання можна назваць літаратурным брэндам Гродзенскай вобласці. Яе ведаюць, чытаюць і паважаюць у Беларусі і за межамі. На прэзентацыю новай працы пісьменніцы сабраліся прадстаўнікі розных пакаленняў, калегі і сябры творцы, студэнты Купалаўскага ўніверсітэта. Усіх зацікавіла проза, што выйшла з-пад пяра прызнанага майстра паэзіі.

Зборнік аповесцяў «Жыццёвыя путы» пабачыў свет у Выдавецкім доме «Звязда» (Мінск). Як паведамлялася раней, кніга складаецца з чатырох аповесцяў. З аналітычнымі аглядамі гэтых твораў па чарзе выступілі літаратурныя крытыкі. Кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, член СПБ, літаратуразнавец, фалькларыст Руслан Казлоўскі не толькі падзяліўся сваімі ўражаннямі ад тытульнай аповесці «Жыццёвыя путы», адзначыў арыгінальны стыль аўтара, але і прывёў цэлы шэраг прычын, па якіх другую кнігу прозы Людмілы Антонаўны Кебіч (першая – «Дамінанты лёсу» выйшла ў 2014 годзе) можна аднесці да элітарнай (ня масавай) літаратуры. Яшчэ адзін удзельнік імпрэзы, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы, літаратуразнаўца, літаратурны крытык Аліна Сабуць сёлета стала лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў адпаведнай намінацыі. Як вопытны даследчык, Аліна Эдмундаўна на прыкладах з тэксту падрабязна ахарактарызавала найбольш значныя, на яе погляд, моманты ў аповесці «До, рэ, мі, фа, соль, або Канцавая станцыя», патлумачыла сэнс падвоенай назвы твора. Пра свае адкрыцці, зробленыя падчас знаёмства з аповесцю «Другі дубль» аўдыторыі распавёў член СПБ, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык. У ролі эксперта чытач падзякаваў аўтару за магчымасць выказаць свае рэфлексіі без лісліваcці, аб'ектыўна і канструктыўна. У фінале аналітычнага блоку імпрэзы выступіла педагог-філолаг, паэтэса Наталія Чакун. Гродзенская гімназія № 5, дзе Наталія Васільеўна працуе настаўнцай беларускай мовы і літаратуры, з гонарам носіць імя Уладзіміра Караткевіча. Таму размова пра сучасную айчынную літаратуру нечакана набыла сімвалічны сэнс повязі часоў, пераемнасці пакаленняў.

Наталія Васільеўна імкнулася данесці ўвесь трагізм і ідэйную глыбіню сюжэту апошняй у кнізе аповесці «Выбух». На думку настаўніцы, твор варта ўключыць у школьную праграму, – такі ён мае каштоўны выхаваўчы патэнцыял.

Крытыкамі былі падкрэслены дзве важныя асаблівасці кнігі Людмілы Кебіч «Жыццёвыя путы». Па-першае, гэта так званы рэгіянальны фактар – удала выкарыстаныя ў аповесцях прыкметы нашага Прынёманскага краю, мясцовы каларыт. Таксама заслугоўвае захаплення мова прозы ад беларускай паэтэсы – па-народнаму сакавітая і арганічная; гаворка герояў максімальна рэалістычная, трапная, быццам падслуханая ў рэальным жыцці. Нягледзячы на ўсе яго хітрасплячэнні, перыпетыі, калізіі, адным словам – путы.

Аналітычныя агляды выдання чаргаваліся з музычнымі блокамі: на экране дэманстраваліся відэакліпы з песнямі на словы Людмілы Кебіч; аўтар музыкі Ірына Траццяк. Сябры і калегі сардэчна павіншавалі Людмілу Антонаўну з новым этапам творчага шляху. Пры падтрымцы Выдавецкага дома «Звязда» былі арганізаваны продаж кніг і аўтограф-сесія пісьменніцы. У пахмурны восеньскі дзень знаёмства з новай кнігай стварыла асаблівы прыўзняты настрой. Талент майстра здолеў падарыць чытачам сапраўднае свята, а традыцыі беларускай прозы атрымалі годны працяг.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На фота:** эпізоды і ўдзельнікі прэзентацыі кнігі Людмілы Кебіч «Жыццёвыя путы» (Мінск, ВД «Звязда», 2023). Аддзел мастацтва ГАНБ імя Я. Ф. Карскага. 26 кастрычніка 2023 года.




Прэзентацыя новай кнігі
Людмілы Кебіч








Искусство в книге,
книга как искус
Прэзентацыя новай кнігі
Людмілы Кебіч
ЗВЯЗДА
ZVIAZDA.BY
220013, г. Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
Тэлефон/факс:
311 17 13
Аддзел маркетынгу:
263-66-73,
271-81-53 (факс)
Жыццёвыя путы


Искусство в книге,
книга как искусство
ГОТИКА
ИСКУССТВО МОДЕРНА


искусство в книге,
книга как искусство
Прэзентацыя новай кнігі
Людмілы Кебіч
ГОТИКА
ПРЕРАФАЭЛИТЫ
100 ГОРОДОВ МИРА


книга как искусство
Прэзентацыя новай кнігі


Людміла Кебіч
Жыццёвыя путы


Искусство в книге,
книга как искусство
ЗВЯЗДА
ZVIAZDA.BY
220013, г. Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
Тэлефон/факс:
311 17 13
ГОТИКА
ПРЕРАФАЭЛИТЫ


Прэзентацыя новай кнігі
Жыццёвыя путы
Кебіч


книга как искусство
Жыццёвыя путы
Кебіч
ГОТИКА
100 СОКРОВИЩ ЧЕЛОВЕЧЕСТВА
100 ГОРОДОВ МИРА


Прэзентацыя новай кнігі
ЖЫЦЦЁВЫЯ ПУТЫ
ГОТИКА
ПРЕРАФАЭЛИТЫ
100 СОКРОВИЩ ЧЕЛОВЕЧЕСТВА
100 ГОРОДОВ МИРА
ЗВЯЗДА
ВЫДАВЕЦКІ ДОМ


ЗВЯЗДА
ZVIAZDA
ГОТИКА
ПРЕРАФАЭЛИТЫ
ИСКУССТВО МОДЕРНА
100 ГОРОДОВ МИРА


книга как искусство
Прэзентацыя новай кнігі
юдмілы Кебіч
Жыццёвыя путы


Искусство в книге,
книга как искусство
Прэзентацыя новай кнігі
Жыццёвыя путы
ГОТИКА
ПРЕРАФАЭЛИТЫ
ИСКУССТВО МОДЕРНА
СОКРОВИЩА ВОСТОКА


Искусство в книге,
книга как искусство
Прэзентацыя новай кнігі
ГОТИКА
ЖИВОПИСЬ БАРОККО
ЖИВОПИСЬ РЕНЕССАНСА
ИСКУССТВО МОДЕРНА


Искусство в книге,
книга как искусство
Прэзентацыя новай кнігі
Людмила Кебич
ЖЫЦЦЁВЫЯ ПУТЫ
ГОТИКА
ИСКУССТВО МОДЕРНА
ВЕНЕЦИЯ
ПОП-АРТ
Decorum


Прэзентацыя новай кнігі
Кебіч


ЗВЯЗДА
ZVIAZDA
100 СОКРОВИЩ


новай кнігі
Кебіч


ЗВЯЗДА
ZVIAZDA.BY
Прэзентацыя новай кнігі
Людмілы Кебіч
ЖЫЦЦЁВЫЯ ПУТЫ
САКРАЛЬНЫЕ МЕСТА РОССИИ


книга как искусство







Фота **Анатоля Апанасевіча** [www.pisateli.by](http://www.pisateli.by)

**Пра падзею [на сайце ГАНБ імя Я. Карскага]()**